# Прыродаахоўная дзейнасць падчас хрушчоўскай «адлігі»

**Ідэя беражлівых адносінаў да прыроды прысутнічала на ўсіх гістарычных этапах развіцця беларускага народа. Але на працягу XX стагоддзя пад уплывам працэсаў індустрыялізацыі і ўрбанізацыі яго экалагічная свядомасць перажыла глыбінныя працэсы трансфармацыі. Найбольшую дынаміку яны набылі на мяжы 1948—1953 гадоў падчас рэалізацыі «сталінскага плана пераўтварэння прыроды», які не быў здадзены ў архіў і пасля яго смерці. У перыяд хрушчоўскай «адлігі» працэсы індустрыялізацыі і ўрбанізацыі набылі новую дынаміку.**

**Узрасла роля грамадства**

Пасля смерці Сталіна функцыі аховы прыроды ў БССР ажыццяўлялі Галоўнае ўпраўленне паляўнічай гаспадаркі пры Савеце Міністраў БССР, а таксама Дзяржаўная інспекцыя па ахове рыбных занасаў і рэгуляванні рыбалоўства Саўнаргаса БССР. Падобная раскіданасць не спрыяла выпрацоўцы адзінай стратэгіі прыродакарыстання, асэнсаванню і вырашэнню найболын вострых экалагічных праблем. У гэтай сітуацыі ў справе рэгулявання пытанняў прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя ўзрасла роля грамадства. І Іадчас публічных дыскусій навуковая грамадскасць атрымала права на крытыку дзяржаўнай палітыкі прыродакарыстання. Былі ўзноўлены скасаваныя ў сталінскія часы запаведнікі. Насельніцтву была дазволена самаарганізацыя ў сферах добраўпарадкавання, азелянення і самазабеспячэння прадуктамі харчавання. Экалагічная праблематыка начала фарміраваць публічны дыскурс.

Штуршок першым грамадскім прыродаахоўным ініцыятывам дало рашэнне прэзідыума Акадэміі навук БССР аб стварэнні ў 1956 годзе пры аддзяленні біялагічных і сельскагаспадарчых навук Камісіі па ахове прыроды пад кіраўніцтвам віцэ-прэзідэнта І. С. Лупіновіча (на фота). Тэты крок быў адказам навуковай супольнасці перш за ўсё на гіарушэнні правілаў палявання і рыбнай лоўлі ў БССР, якія да сярэдзіны 1950-х гадоў набылі настолькі масавы характар, што пагражалі прыроднаму балансу рэспублікі. Развіццю браканьерства сйрыяў не толькі сфарміраваны падчас сталінскай індустрыялізацыі спажывецкі тып адносінаў да прыроды, але таксама шматлікія нарыхтоўчыя канторы, якія часта парушалі правілы прыёму сыравіны.

У 1956 годзе вядучы беларускі глебазнаўца, акадэмік П. П. Рагавы выступіў за аднаўленне Бярэзінскага і Вялаўскага запаведнікаў, а таксама Галоўнага ўпраўлення пазапаведніках пры Савеце Міністраў БССР. Неўзабаве гэтая прапанова атрымала развіццё ў артыкуле групы супрацоўнікаў Інстытута біялогіі Акадэміі навук БССР на чале з вядомым заолагам І. М. Сяржаніным.

Адразу пасля стварэння ў 1955 годзе ў барацьбу з браканьерамі ўключылася Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў. На працягу 1957-га і ў першыя месяцы 1958-га з дапамогай сяброў таварыства былі выяўлены больш за 450 выпадкаў парушэння гіравілаў палявання і рыбнай лоўлі.

Неўзабаве да беларускага прырода-ахоўнага руху далучыўся камсамол. Напрыканцы чэрвеня 1959 года Мінскі абкам ЛКСМБ прыняў пастанову аб удзеле камсамольцаў і моладзі вобласці ў ахове зялёных насаджэнняў. Пры абкаме быў створаны штаб «зялёных патрулёў», куды ўвайшлі спецыялісты, камсамольскія работнікі, садаводы-аматары, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый.

Экалагічную культуру ў свядомасць школьнікаў укаранялі беларускія пісьменнікі. Рух у абарону роднай прыроды падтрымала і старэйшае пакаленне.

Напрыклад, пенсіянер-садавод М. П. Ахрыменка выступіў у 1959 годзе з ініцыятывай стварэння Таварыства сяброў зялёных насаджэнняў. Неўзабаве пачалося правядзенне рэспубліканскіх месячнікаў «За ахову прыроды».



**У 1956 годзе акадэмік Рагавы выступіў за аднаўленне Бярэзінскага і Вялаускага запаведнікаў.**

**З мэтай аховы і рацыянальнага выкарыстання**

Нарэшце ахову навакольнага асяродцзя ў якасці адной з функцый на арганізацыйным узроўні вызначыла дзяржава. З мэтай аховы і радыянальнага выкарыстання прыродных багаццяў пастановай ад 29 жніўня 1960 года Савет Міністраў БССР стварыў у сваім складзе Дзяржаўны камітэт па ахове прыроды са структурнымі падраздзяленнямі ў выглядзе абласных інспекцый. Старшынёй камітэта быў прызначаны адзін з арганізатараў партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі, Герой Савецкага Саюза І. М. Цімчук. Новаму камітэту былі перададзены Дзяржаўная інспекцыя па ахове рыбных запасаў і рэгуляванні рыбалоўства Саўнаргаса БССР, Галоўнае ўпраўленне лясной гаспадаркі пры Савеце Міністраў БССР, атаксама Бярэзінскі запаведнік з шэрагам паляўнічых заказнікаў.

У адпаведнасці з накірункамі работы Дзяржкамітэт па ахове прыроды структурна складаўся з аддзелаў вывучэння і ўліку водных рэсурсаў; аховы водных рэсурсаў і воднагаспадарчых аб'ектаў; навукова-тэхнічнай інфармацыі; па ахове зямельных і лясных угоддзяў; па разглядзе праектаў і навукова-даследчай рабоце, а таксама ўпраўлення па справах паляўнічай гаспадаркі і запаведнікаў, Дзяржінспекцыі па ахове рыбных запасаў і рэгуляванні рыбалоўства «Белдзяржрыбвад». Камітэт рыхтаваў для ўрада праекты прыродаахоўных заканадаўчых актаў (напрыклад, «Аб помніках прыроды»); маніторыў шкодныя скіды прадпрыемстваў; кантраляваў будаўніцгва ачышчальных збудаванняў і каналізацыйных сістэм, рацыянальнае выкарыстанне лясоў, зарыбление вадаёмаў, эрозію глебаў, будаўніцтва паркаў і сквераў; адкрываў паляўнічыя і рыбалоўныя сезоны.

У 1961 годзе кіраўніцтва камітэта пакарала штрафам Мінскі завод ацяпляльнага абсталявання за неачышчаныя скіды ў Камсамольскае возера. У 1962 годзе камітэт хадайнічаў перад Упраўленнем харчовай прамысловасці Савета народнай гаспадаркі БССР аб тэрміновым закрыцці Шацкага крухмальнага завода за скід забруджаных вод у раку Шаць.

Пастановай ад 29 жніўня 1960 года Савет Міністраў БССР стварыў у сваім складзе Дзяржаўны камітэт па ахове прыроды са структурнымі падраздзяленнямі ў выглядзе абласных інспекцый.



**Адміністрацыйны корпус Дзяржаўнай запаведна-паляўнічай гаспадаркі «Белавежская пушча», 1950—60-я гады.**

**1961: прыняты закон «Аб ахове прыроды»**

Напачатку Дзяржаўны камітэт па ахове прыроды разам з Дзяржаўнай санітарнай інспекцыяй Міністэрства аховы здароўя БССР зрабіліся аб’ектамі крытыкі ў СМІ «занерашучыя дзеянні». Вынікам гэтай нерашучасці былі 23 тыс. кубаметраў забруджанай вады, якую штогод скідвалі праз ручай Сляпянка ў Свіслач МАЗ і МТЗ, 15 тыс. штогадовых кубічных метраў мазуту ў Заходняй Дзвіне з Віцебскай ЦЭЦ, тоны атрутнага крэазоту, якія спускаў Нова-Барысаўскі шпала-прапітачны завод у Бярэзіну.

Рэйд па праверцы забруджанасці беларускіх рэк, йраведзены рэдакцыяй газеты «Советская Белоруссия» летам 1961 года, неўзабаве пасля з’яўлення пастановы Савета Міністраў БССР аб упарадкаванні выкарыстання водных рэсурсаў, выкрыў праблемы з ачышчальнымі збудаваннямі на будаўніцтве Навапалацкага наф гаперапрацоўчага завода і Салігорскага калійнага камбіната, якія забруджвалі Заходнюю Дзвіну і Случ.

Дзейнасць Дзяржаўнага камітэта па ахове прыроды Савета Міністраў БССР набыла трывалую юрыдычную глебу пасля таго, як 21 снежня 1961 года Вярхоўны Савет рэспублікі прыняў закон «Аб ахове прыроды». У ім прыродаахоўная дзейнасць была вызначана ў якасці важнейшай дзяржаўнай заданы і справы ўсяго народа. Закон змяшчаў пералік аб’ектаў прыроды, якія падлягалі ахове, забараняў забруджванне вадаёмаў, самавольную высечку лясоў, знішчэнне рэдкіх відаў жывёл. Асобныя яго раздзелы былі прысвечаны арганізацыі запаведнікаў і заказнікаў, уліку і планаванню выкарыстання прыродных рэсурсаў, а таксама кантролю за аховай прыроды.

Падрыхтоўка закона «Аб ахове прыроды» актуалізавала выкананне пастановы Саветы Міністраў БССР ад 30 снежня 1959 года, якая дазваляла будаўніцтва новых прамысловых прадпрыемстваў толькі пры ўмове ажыццяўлення меранрыемстваў па санітарнай ахове атмасферы ад забруджвання прамысловымі адходамі, а таксама азелянення. Так у Мінску на працягу 1961 года на газавае паліва былі пераведзены каля 50 прадпрыемстваў і 21 ка-цельная, у выніку чаго забруджванне паветра ў сталіцы зменшылася на 30 % у параўнанні з 1957 годам.

Развіццю браканьерства спрыяў не толькі сфарміраваны падчас сталінскай індустрыялізацыі спажывецкі тып адносінаў да прыроды, але таксама шматлікія нарыхтоўчыя канторы, якія часта парушалі правілы прыёму сыравіны.

**Сацыялістычнае спаборніцтва за чысціню азёр і рэк**

У 1962 годзе па ініцыятыве калектываў прадпрыемстваў Рэчыцы ў рэспубліцы разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва за чысціню азёр і рэк. Па выніках года ганаровымі граматамі за ўкараненне ачышчальных збудаванняў былі ўзнагароджаны Мінскі станкабудаўнічы завод імя Касгрычніцкай рэвалюцыі, Магілёўскі завод штучнага валакна, Крычаўскі цэментна-шыферны завод і кардонная фабрыка «Раеўка», а работнікаў гэтых прадпрыемстваў прэміравалі. У 1962 годзе Саўнаргас БССР выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва за чысціню рэк Саўнаргасы Літоўскай ССР і Валгаградскай вобласці РСФСР.

Разам з тым санітарна-эпідэмічнае ўпраўленне Міністэрства аховы здароўя БССР настойвала на больш маштабных і эфектыўных захадах па нармалізацыі экалагічнай сітуацыі ў рэспубліцы. Замеры зафіксавалі запыленасць і задымленасць паветра на Прывакзальнай плошчы, у раёне Чэрвенскага рынку, а таксама ў наваколлі хлеб-завода № 1 г. Мінска, якія пераўзыходзілі нормы ў 4-6 разоў. У сталічным парку Чалюскінцаў канцэнтрацыя сярністага газу была больш за нарматыўную ў чатыры разы. У 4-5 разоў перавышала норму колькасць угарнага газу на сталічным Ленінскім ираспекце, а таксама вуліцах Маскоўскай, Чкалава, Падлеснай, Я. Коласа. У 1963 годзе прамысловыя прадпрыемствы Мінска штодня выкідалі ў атмасферу 150 тон шкодных рэчываў.

Крычаўскі цэментавы завод за год выкідаў у паветра да 50 тон сыравіннага пылу. У Ваўкавыску пусцілі цэментавы завод таксама без пылазборніка.

З 3430 правераных у 1962 годзе Дзяржаўным камітэтам па ахове прыроды суб’ектаў гаспадарання рэспублікі, якія ўжывалі ваду для вытворчых патрэб, 1302 не мелі ачышчальных збудаванняў і штодня скідвалі ў вадаёмы тысячы кубоў брудных вод. Больш за тое, у тым жа годзе 360 прадпрыемстваў БССР не зменшылі, а павялічылі скіды вод без ачысткі. Напрыклад, мінскія прамысловыя прадпрыемствы штосутачна скідвалі ў Свіслач 202 тыс. кубічных метраў забруджаных вод. Працягвалі з нарастаючымі тэмпамі атручваць навакольныя вадаёмы і 76 % прадпрыемстваў Беларускай чыгункі.

Працяг публікацыі — у наступным нумары.

Аляксандр ГУЖАЛОЎСКІ,
доктар гістарычных навук, прафесар